(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А. А. КУЛЯШОВА”

Аб’ект аўтарскага права
УДК 903’1(476)”632”

**ГАРШКОЎ**
**Аляксандр Дзмітрыевіч**

# КУЛЬТУРА БРОМЕ Ў МІЖРЭЧЧЫ ЗАХОДНЯГА БУГА, ПРЫПЯЦІ І НЁМАНА: ЗАСЯЛЕННЕ, ХРАНАЛОГІЯ, МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія

Магілёў, 2024

Навуковая работа выканана ва ўстанове адукацыі
“Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік | **Піваварчык Сяргей Аркадзьевіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ўстановы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы” |
| Афіцыйныя апаненты: | **Віцязь Сяргей Пятровіч,** доктар гістарычных навук, намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце дзяржаўнай навуковай установы “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” |
| | **Бубенька Таццяна Станіславаўна,** кандыдат гістарычны навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага сектара ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава” |
| Апаніруючая арганізацыя | **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт** |

Абарона адбудзецца 23 мая 2024 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.03.01 пры ўстанове адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова” па адрасе: 212022, г. Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1, аўд. 115; тэлефон вучонага сакратара: 8 (222) 60-24-80; e-mail: melnikova_as@msu.by

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”.

Аўтарэферат разасланы “27” сакавіка 2024 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый А. С. Мельнікава

# УВОДЗІНЫ

Тэрыторыя Заходнебугска-Прыпяцка-Нёманскага міжрэчча ў позналедавіковы перыяд адной з першых была заселена паляўнічымі-збіральнікамі эпохі фінальнага палеаліту. У гэты час адбывалася актыўнае асваенне Усходне-Еўрапейскай раўніны прадстаўнікамі археалагічных культур, якія адносяцца да тэхнакомплекса з чаранковымі і лістападобнымі наканечнікамі стрэл. Першай падобнай адзінкай у міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана, прысутнасць якой фіксуецца па наяўнасці дзясяткаў стаянак і месцазнаходжанняў, з'яўляецца броме (у беларускай гістарыяграфіі – лінгбі або броме-лінгбі).

Дадзеная культура была вылучана на падставе крамянёвага інвентару і рагавых сякер тыпу Лінгбі, вядомых яшчэ з канца XIX стагоддзя. У 1913 г. на помніку Норэ Лінгбі (Данія) быў зафіксаваны першы чаранковы наканечнік, а з 20-х гг. XX ст. у навуковай літаратуры для характарыстыкі падобных матэрыялаў пачаў выкарыстоўвацца тэрмін "культура лінгбі". У 1936 г. брытанскі навуковец Г. Кларк на падставе спецыфічных наканечнікаў стрэл аднёс іх у асобную групу і далучыў да кола культур з чаранковымі наканечнікамі стрэл. У 1954 г. дацкім археолагам Ю. Молынам былі апублікаваны вынікі даследаванняў стаянкі Броме на паўвостраве Зеландыя (Данія). Помнік стаў эпанімным для культуры броме, але аўтар лічыў, што ён не мае дачынення да культуры лінгбі і яго матэрыялы трэба параўноўваць з комплексамі з тэрыторыі Усходняй Еўропы. Аднак пазнейшыя даследаванні паказалі падабенства паміж броме і лінгбі, што дазволіла аб'яднаць іх у адну археалагічную супольнасць.

У беларускай гістарыяграфіі матэрыялы папуляцыі броме ў Заходнебугска-Прыпяцка-Нёманскім міжрэччы пачалі вылучаць у 60-я гг. XX ст. Беларускі археолаг У. Ф. Ісаенка, аналізуючы крамянёвыя артэфакты з тэрыторыі Заходняга Палесся, упершыню вылучыў наканечнікі тыпу Лінгбі. Аднак да 90-х гг. XX ст. дадзеная археалагічная культура ў беларускай гістарыяграфіі не разглядалася або даследавалася ў кантэксце прыбалтыйскага мадлену. Сітуацыя змянілася на рубяжы XX–XXI стст. дзякуючы працам беларускіх археолагаў В. Я. Кудрашова і В. Л. Ліпніцкай на помніках у басейне р. Рось, а таксама дзейнасці В. С. Абухоўскага, які перагледзеў назапашаныя ў папярэднія часы матэрыялы і вылучыў цэлы шэраг археалагічных культур, якія існавалі ў фінальным палеаліце на гэтых тэрыторыях. На сучасны момант у міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана ў літаратуры ўзгадваецца ад 30 да 48 помнікаў з матэрыяламі, характэрнымі для броме. Вынікі папярэдняга вывучэння помнікаў культуры броме прысутнічаюць у некаторых акадэмічных і манаграфічных выданнях, але ў кантэксце ўсіх старажытнасцей каменнага веку на тэрыторыі

Беларусі. Такі стан распрацоўкі дадзенай праблематыкі патрабуе комплекснага навуковага даследавання рэгіянальнага матэрыялу, які раней разглядаўся ў шырокім кантэксце.

Актуальнасць дадзенай дысертацыі вызначаецца тым, што культура бромe ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана не была прадметам спецыяльнага вывучэння ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. У сувязі з гэтым актуальнымі праблемамі з'яўляюцца: спосабы адаптацыі носьбітаў культуры бромe да мясцовай сыравіны і іх уплыў на вытворчасць крамянёвых прыладаў працы; тапаграфія і стратыграфія паселішчаў; функцыянальная прыналежнасць стаянак; палеаэканамічныя аспекты жыццядзейнасці носьбітаў культуры бромe; міграцыйныя шляхі фінальнапалеалітычнага насельніцтва ў Еўропе.

**Геаграфічнымі рамкамі даследавання** з'яўляецца беларуская частка цячэння рэк Заходні Буг (правабярэжжа) і Нёман (левабярэжжа), а таксама басейн Прыпяці ў яго верхнім і часткова сярэднім цячэннях (да р. Лань (левы прыток) і р. Гарынь (правы прыток)). У адміністрацыйна-тэрытарыяльным плане дысертацыйнае даследаванне ахоплівае Гродзенскую (акрамя паўночнага захаду), Брэсцкую вобласці, паўднёва-заходнюю частку Мінскай вобласці Рэспублікі Беларусь. Яшчэ адзін помнік – стаянка Нобель – размешчана ў непасрэднай блізкасці да паўднёвай мяжы нашай краіны. Тэрытарыяльныя межы вызначаны на аснове размяшчэння найбольшай колькасці помнікаў культуры бромe і вылучаны на падставе картаграфіі археалагічных аб'ектаў пры дапамозе геаінфармацыйных сістэм. Усе прывязкі і картаграфічны ілюстрацыйны матэрыял стаянак і месцазнаходжанняў выкананы ў праграмах GoogleEarth, SAS Planet, QGIS і ArcGIS з выкарыстаннем сістэмы каардынат WGS 84.

**Храналагічныя рамкі даследавання** абумоўлены з'яўленнем носьбітаў культуры бромe ў Заходнебугска-Прыпяцка-Нёманскім міжрэччы і іх міграцыяй на паўночны ўсход. Ніжняя мяжа (каля 13 тыс. гадоў таму) вызначана на падставе радыёвугляродных датыровак вывяржэння вулкана Лах (зараз возера Лаахер Зээ, Германія) і стаянак у асноўным арэале распаўсюджвання культуры бромe. Верхняя мяжа абумоўлена пранікненнем дадзенага насельніцтва ў басейн р. Дняпро і на Валдайскае ўзвышша ў дрыясе III (12,7–11,7 тыс. гадоў таму). У рабоце выкарыстоўваюцца значэнні датыровак, каліброваныя аўтарам у праграме OxCal для карэляцыі матэрыялаў з данымі прыродазначаўчых навук і пазбягання разыходжанняў, характэрных для радыёвугляроднага датавання позналедавіковых матэрыялаў.

Для высвятлення храналогіі аб'ектаў у дысертацыі, па магчымасці, прымяняліся радыёвугляродны і OSL метады датавання, якія, у спалучэнні з тэхніка-марфалагічным аналізам артэфактаў, даследаваннем тапаграфіі, стратыграфіі і мікрастратыграфіі, дазволілі рэканструяваць працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі помнікаў з іх прывязкай да адносных шкал. Структура

і спецыялізацыя паселішчаў высвятляліся дзякуючы даследаванню складу крамянёвага інвентару і прымяненню методыкі трохмернай фіксацыі матэрыялаў.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь даследавання з навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі

Дысертацыя падрыхтавана на кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы".

Тэматыка даследавання адпавядае Пераліку прыярытэтных напрамкаў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці на 2021–2025 гг., зацверджанаму Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.03.2020 № 156 (раздзел 6 "Забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы") і Дзяржаўнай праграме навуковых даследаванняў "Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы" (падпраграма № 1 "Гісторыя") на 2021–2025 гг.

Шэраг кірункаў дысертацыі распрацоўваўся ў рамках гранта БРФФД–РФФД № Г20Р-126 "Поздний и финальный палеолит Верхнего Поднепровья на территории белорусско-российского порубежья: локальные различия и кросс-культурные связи", 2020–2022 гг., навуковы кіраўнік – А. Г. Калечыц, доктар гістарычных навук, прафесар.

### Мэты, задачы, аб'ект і прадмет дысертацыйнага даследавання

**Мэтай** дысертацыйнага даследавання з'яўляецца выяўленне асаблівасцяў развіцця культуры броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

1) вызначыць прыродна-кліматычныя ўмовы фінальнага этапу позняга плейстацэну і раскрыць іх уплыў на засяленне міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана носьбітамі культуры броме;

2) выявіць тапаграфічныя і стратыграфічныя асаблівасці паселішчаў і вызначыць іх структуру і гаспадарчую спецыялізацыю;

3) ахарактарызаваць матэрыяльную культуру насельніцтва броме Заходнебугска-Прыпяцка-Нёманскага міжрэчча;

4) устанавіць храналогію і гістарычны лёс культуры броме ў кантэксце эвалюцыі агульнаеўрапейскіх цывілізацыйных працэсаў.

**Аб'ектам** даследавання з'яўляецца фінальны палеаліт на тэрыторыі Беларусі.

**Прадмет** – культура броме на тэрыторыі Заходнебугска-Прыпяцка-Нёманскага міжрэчча.

**Навуковая навізна**

У дысертацыі ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі праведзены параўнаўчы аналіз матэрыялаў, характэрных для культуры броме, якія паходзяць з міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці, Нёмана і асноўнага арэала распаўсюджвання дадзенай культурнай адзінкі. Вызначаны ўплыў прыродна-кліматычных умоў на ступень засялення і спецыфіку гаспадарча-культурнага тыпу паляўнічых-збіральнікаў. Выяўлены прычыны з’яўлення культуры броме і яе гістарычны лёс на даследуемай тэрыторыі. Дысертантам удакладнена канцэпцыя характарыстыкі палявання і збіральніцтва, якая дапаўняе прынятыя ўяўленні аб гаспадарцы даследуемага насельніцтва. Ахарактарызаваны гаспадарча-бытавыя комплексы і іх структурныя адзінкі. Упершыню для вызначэння функцыянальнай прыналежнасці элементаў кідальнага ўзбраення прыменены метады матэматычнай карэляцыі колькасных паказчыкаў і TSCA-аналіз (вылічэнне плошчы папярочнага сячэння). Уведзены ў навуковы зварот новыя матэрыялы, атрыманыя падчас палявых археалагічных даследаванняў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Асваенне міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана носьбітамі культуры броме адбывалася з паўночна-заходняга накірунку, пераважна – з тэрыторыі прыбалтыйскага ўзбярэжжа. Гэта абумоўліваецца генезісам дадзенай культурнай адзінкі, які звязваецца з вывяржэннем вулкана Лах у Германіі каля 13 тыс. гадоў таму. Носьбіты культуры федэрмесер былі падзелены гэтай падзеяй, як мінімум, на дзве групы, якія мігравалі ў розных накірунках. Адна з іх асвоіла поўнач Германіі, паўднёвыя раёны Даніі і Швецыі. Катастрафічныя падзеі, выкліканыя вывяржэннем, істотна паўплывалі на матэрыяльную культуру гэтай групы, што дазволіла пазней інтэрпрэтаваць яе як асобную археалагічную культурную адзінку. У канцы алерода адбываецца паніжэнне ўзроўню Балтыйскага мора, што, у тым ліку, прыводзіць да пахаладання і змянення прыродна-кліматычных умоў. Распаўсюджванне тундры і лесатундры ў шыротах, у якіх пражывалі носьбіты культуры броме, прывяло да іх міграцыі ва ўсходнім накірунку. Гэтыя працэсы паўплывалі і на іх гаспадарчую дзейнасць, асновай якой становіцца паляванне на паўночнага аленя, які здзяйсняе сезонныя перамяшчэнні на даволі значныя адлегласці.

2. Асноўная частка паселішчаў культуры броме прымеркавана на даследуемай тэрыторыі да марэнных узвышшаў і зандравых плато (раўнін), размешчаных у непасрэднай блізкасці да вадаёмаў. Пры гэтым існуюць лакальныя адрозненні. У басейне р. Нёман частка помнікаў (Кавальцы 1, 2, 4; Жылічы 1; Краснасельскі 5, 7) знаходзяцца ў вусці рэк або яроў. Стаянкі з берагоў Заходняга Буга і Прыпяці размешчаны на ўзвышшах непадалёку ад рэк і азёр. Такое размяшчэнне выклікана наяўнасцю ў падобнай мясцовасці крамянёвай сыравіны і сезоннасцю паселішчаў. У перыяд існавання культуры

броме на даследуемай тэрыторыі асноўным аб’ектам палявання з’яўляўся паўночны алень. Згодна з этнаграфічнымі данымі, яго міграцыя адбывалася вясной у паўночным, а восенню ў паўднёвым накірунках. Гэта дазваляе інтэрпрэтаваць стаянкі ў басейне р. Нёман як вясенне-летнія, а на Заходнім Бугу і Прыпяці – як восеньска-зімовыя. Іх фарміраванне адбывалася невялікімі групамі асоб, якія вялі сезонны лад жыцця. Асноўным тыпам паселішча з’яўляліся стаянкі-майстэрні, якія ў вялікай колькасці зафіксаваныя на р. Нёман. Яны складаліся з лёгкага каркаснага жытла, вогнішча, вакол якога канцэнтраваліся гаспадарчыя зоны; месца майстра і вучня; месца ўтылізацыі прадуктаў палявання, збіральніцтва і, верагодна, рыбалоўства; ямы-сметніцы.

3. Тэхніка-марфалагічны аналіз матэрыялаў з міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана паказвае на іх поўнае падабенства з калекцыямі, якія былі атрыманы на помніках, размешчаных у асноўным арэале культуры броме. У якасці сыравіны выкарыстоўваўся мясцовы крэмень марэннага паходжання светла-шэрага, шэрага адценняў. Тэхналогія базавалася на эксплуатацыі аднапляцовачных, радзей двухпляцовачных нуклеусаў пры дапамозе цвёрдага каменнага адбойніка. У якасці нарыхтовак выкарыстоўваліся пласціны і адшчэпы ў залежнасці ад тыпу фармальнай прылады. Да іх адносяцца наканечнікі, разцы і скрабкі. Часам у якасці прыладаў выкарыстоўваліся рэтушаваныя прадукты дэбітажу.

Наканечнікі паходзяць ад дзідаў (у тым ліку для коп’екідалак). Дадзеныя прадметы чаранковыя, фармаваліся на пласцінах, якія мелі дыстальную частку, падвостраную суседнімі або перпендыкулярнымі фронту сколамі. Чаранок афармляўся стромкай дарсальнай рэтушшу ў праксімальнай частцы нарыхтоўкі. Яго абрысы маюць падпрамавугольную або трохвугольную форму ў анфас. Пяро і цела наканечніка звычайна не апрацоўваліся, часам маглі падпраўляцца паўстромкай рэтушшу. Разцы выконваліся на пласцінах і адшчэпах, мелі двухгранныя сярэдзінныя, двухгранныя бакавыя, бакавыя рэтушныя формы. У некаторых выпадках на адной з граняў (часцей – правай) у праксімальнай частцы прысутнічае дарсальная паўстромкая рэтуш. Скрабкі выключна маюць канцавыя формы, выкананыя на пласцінах або фрагментах пласцін.

У наборы прыладаў адрозненні на ўсёй тэрыторыі міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана адсутнічаюць. Адзіная розніца заключаецца ў памерах артэфактаў, што, у сваю чаргу, звязваецца з сыравіннай базай, якая выкарыстоўвалася носьбітамі культуры броме.

4. Згодна з прынятай канцэпцыяй фарміравання культуры броме на тэрыторыі паўночнай Германіі і паўднёвых раёнаў Даніі і Швецыі, пасля вывяржэння вулкана Лах каля 13 тыс. гадоў таму носьбіты дадзенай культурнай адзінкі ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана з’явіліся не раней за гэтую дату. Хутчэй за ўсё, гэта адбылося пасля блакіроўкі стокаў Балтыйскага

ледавіковага возера ў раёне Сярэднешвецкай нізіны Балтыйскага ледавіковага возера (канец алерода – пачатак дрыяса III). Менавіта ў гэты час, згодна радыёвугляродным датыроўкам, перастаюць існаваць стаянкі ў межах першапачатковага арэала і з'яўляюцца паселішчы ў Прыбалтыцы. Адсутнасць абсалютных датыровак, атрыманых шляхам выкарыстання прыродазнаўчых навук з даследуемай тэрыторыі, ускладняе вызначэнне перыяду жыццядзейнасці ў гэтай мясцовасці культуры броме. У дрыясе III носьбіты дадзенай адзінкі перамяшчаюцца з міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана далей на ўсход – у басейн р. Дняпро і, верагодна, на Валдайскае узвышша. Насельніцтва, якое засталося на даследуемай тэрыторыі і мігрыравала на поўдзень, прыняло ўдзел ў фарміраванні валкушанскай / краснасельскай культур.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені ў вынікі дысертацыі з адмежаваннем іх ад сааўтараў сумесных даследаванняў і публікацый**

Дысертацыя з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем, выкананым на аснове шырокай крыніцазнаўчай базы і навуковай літаратуры. Аўтарам работы прааналізаваны і ўведзены ў навуковы зварот новыя матэрыялы, атрыманыя шляхам археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцей Рэспублікі Беларусь, даныя Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, матэрыялы калекцый з фондаў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальнага гістарычнага музея, Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі, Музея Беларускага Палесся ў г. Пінск, філіяла археалогіі "Нашы карані" Мотальскага музея народнай творчасці, Мінскага абласнога краязнаўчага музея ў г. Маладзечна, Баранавіцкага краязнаўчага музея, археалагічнай экспазіцыі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, музейнай вучэбнай лабараторыі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Агульна было прааналізавана звыш 40 тысяч крамянёвых артэфактаў. Палявыя археалагічныя даследаванні (раскопкі) былі праведзены аўтарам на шасці стаянках (Кавальцы 1, 2; Гродна 14; Гарадзішча 7; Пагараны 1; Зальвяны 2) на плошчы 162 кв.м, з іх 86 кв.м – на помніках культуры броме. Публікацыі па тэме даследавання былі падрыхтаваны як самастойна [2–18; 20–23; 25–27], так і ў сааўтарстве з А. А. Дабрыянам [1], А. Ф. Касюк [19] і С. С. Велент-Шчэрбач [24].

Падчас працы па тэме дысертацыйнага даследавання і ў рэчышчы распрацоўкі праблематыкі гаспадарчай дзейнасці фінальнапалеалітычнага насельніцтва Беларусі аўтар быў узнагароджаны дыпломам за перамогу ў конкурсе на лепшы навуковы артыкул, прысвечаным Году гістарычнай памяці і 30-годдзю "Беларускага гістарычнага часопіса".

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні вынікаў**

Вынікі даследавання былі прадстаўлены на 20 навуковых форумах (4 міжнародных навукова-практычных канферэнцыях, 4 міжнародных навуковых канферэнцыях, міжнароднай канферэнцыі, 2 міжнародных навуковых канферэнцыях маладых вучоных, 3 навукова-практычных канферэнцыях, 2 навуковых канферэнцыях, 2 канферэнцыях маладых вучоных, 2 рэспубліканскіх круглых сталах) на тэрыторыі Беларусі і Расіі: міжнароднай навуковай канферэнцыі маладых навукоўцаў "Актуальные проблемы археологии 4. Комплексные исследования в археологии" (г. Санкт-Петербург, 2–5 апреля 2018 г.), II канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі "ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы" (90-годдзю Інстытута гісторыі НАН Беларусі прысвячаецца) (г. Мінск, 4–5 красавіка 2019 г.), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Pax militaris: людзі, узбраенне, фартыфікацыя (ад старажытнасці да пачатку XIX ст.)" (г. Мінск, 25–26 красавіка 2019 г.), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Подготовка научных кадров: опыт, проблемы, перспективы" (г. Минск, 6 декабря 2019 г.), міжнароднай канферэнцыі да 70-годдзя з дня нараджэння Хізры Амірханавіча Амірханава "Восточная Европа, Кавказ, Ближний Восток в каменном веке: хронология, источники и культурогенез" (г. Москва, 3–5 февраля 2020 г.), V і VIII міжнародных навуковых канферэнцыях "Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе" (г. Пинск, 27 ноября 2020 г.; 19–20 мая 2023 г.), навуковых канферэнцыях "LABOR OMNIA VINCIT і LABOR OMNIA VINCIT II. Праца заўсёды перамагае: матэрыяльная культура ў гістарычным кантэксце. Праблемы вывучэння і захавання" (г. Гродна, 6–7 мая 2021 г.; 26–27 мая 2022 г.), міжнародных навукова-практычных канферэнцыях "Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2020, 2021, 2022 гг." (г. Мінск, 19–21 мая 2021 г.; 18–20 мая 2022 г.; 17–19 мая 2023 г.), VI міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў" (г. Полацк, 28–29 красавіка 2022 г.), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Актуальные проблемы экологии – 2022" (г. Гродно, 5–6 апреля 2022 г.), навукова-практычнай канферэнцыі "Гісторыка-культурная спадчына Слонімшчыны: погляд у мінулае" (г. Слонім, 12 жніўня 2022 г.), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных "XVI Машеровские чтения" (г. Віцебск, 21 кастрычніка 2022 г.), рэспубліканскім круглым стале "Археолаг – гэта пакліканне" памяці М. М. Чарняўскага (07.03.1938 – 20.01.2013) (г. Мінск, 23 студзеня 2023 г.), навукова-практычнай канферэнцыі "Ліда і Лідскі край у гісторыі Беларусі (да 700-годдзя горада)" (г. Ліда, 8 верасня 2023 г.), рэспубліканскім круглым стале "Археалогія Беларусі каменнага і бронзавага вякоў: сучасны стан і перспектывы

даследаванняў” памяці Віктара Сцяпанавіча Абухоўскага (11.10.1973 – 04.10.2007) (г. Мінск, 6 кастрычніка 2023 г.), III міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава” (23–24 лістапада 2023 г.).

Вынікі дысертацыйнага даследавання выкарыстаны пры стварэнні экспазіцыі, прысвечанай старажытнай гісторыі Панямоння ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі (акт № 1 ад 25.09.2023); пры распрацоўцы турыстычных маршрутаў па тэрыторыі Гродзенскай вобласці Гродзенскім абласным цэнтрам турызму і краязнаўства (акт № 1 ад 27.09.2023), а таксама пры распрацоўцы вучэбных праграм па курсах “Археалогія”, “Гісторыя першабытнага грамадства” для студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы спецыяльнасці “Гісторыя” (акт №03-0/047 ад 18.10.2023).

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

Вынікі дысертацыйнага даследавання апублікаваны ў 27 навуковых працах агульным аб’ёмам 13 аўт.арк. З іх 10 артыкулаў – у выданнях, якія ўваходзяць у “Пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў”, зацверджаных ВАК Рэспублікі Беларусь, 5 артыкулаў – у зборніках навуковых прац, 7 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, 5 тэзісаў дакладаў – у зборніках матэрыялаў канферэнцый.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з дзвюх частак: тэкставай і дадаткавай. Тэкставая частка складаецца са спісу скарачэнняў і ўмоўных абазначэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, 4 глаў, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц, які змяшчае бібліяграфічны спіс (284 пазіцыі) і спіс публікацый аўтара (27 пазіцый). Поўны аб’ём дысертацыі складае 344 старонкі, з якіх тэкставая частка налічвае 142 старонкі, з іх 26 старонак – спіс выкарыстаных крыніц; дадаткі (табліцы, дыяграмы, карты, малюнкі, акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання) аформлены асобным томам і займаюць 202 старонкі.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА НАВУКОВАЙ СТУПЕНІ

## Артыкулы ў навуковых выданнях у адпаведнасці з п. 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь

1. Горшков А. Д., Добриян А. А. Кремневые комплексы памятников финального палеолита на территории Озёрской низменности // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2018. – Том 10, № 2. – С. 61–70.

2. Гаршкоў А. Д. Крамянёвы інвентар са стаянкі Кавальцы-2 Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці (па матэрыялах даследаванняў 1982 г.) // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2019. – Вып. 30. – С. 182–190.

3. Гаршкоў А. Д. Метады навуковага пазнання пры вывучэнні першабытнай гісторыі Беларусі (у перыяд 300-8 тыс. гадоў да н. э.) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2021. – Том. 13, № 2. – С. 70–78.

4. Горшков А. Д. Природно-климатические условия и их влияние на степень заселения территории Беларуси в первобытную эпоху (40-8 тыс. лет до н. э.) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2022. – Том. 14, № 1. – С. 41–50.

5. Гаршкоў А. Д. Папярэднія вынікі даследаванняў на помніку Кавальцы 1 у 2019 годзе // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2022. – Вып. 32. – С. 139–147.

6. Гаршкоў А. Д. Гаспадарчыя стратэгіі першабытнага насельніцтва па вырабе прыладаў працы ў позналедавіковы час (на прыкладзе помніка Гродна 14) // Беларускі гістарычны часопіс. – 2022. – № 10. – С. 18–26.

7. Гаршкоў А. Д. Паляванне і збіральніцтва ў палеаэканоміцы старажытнага насельніцтва Беларусі ў перыяд 40–10,7 тыс. гадоў таму // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2023. – № 2 (люты). – С. 3–13.

8. Горшков А. Д. Характер палеоэкономической деятельности населения территории Беларуси в период 40–10 тыс. лет назад // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2023. – Т. 15, № 2. – С. 52–58.

9. Гаршкоў А. Д. Культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя групы археалагічных помнікаў каля в. Баля Сольная Гродзенскага раёна (па матэрыялах 1975 г.) // Вестник БарГУ. Серия «Исторические науки. Экономические науки. Юридические науки». – 2023. – Вып. 13. – С. 6–18.

10. Гаршкоў А. Д. Сістэма рассялення і структура паселішчаў фінальнага палеаліту на тэрыторыі Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2023. – № 8. – С. 3–8.

**Артыкулы ў зборніках навуковых прац**

11. Гаршкоў А. Д. Засяленне беларускай часткі басейна ракі Нёман у познеледавіковы час: новыя даныя і перспектывы даследавання // Социальные, культурные и коммуникативные практики в динамике общественного развития : сборник научных статей / Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» ; гл. ред. В. А. Белозорович ; ред. кол.: Н. Л. Улейчик [и др.]. – Гродно: ГрГУ им. Янки Купалы, 2021. – С. 93–101.

12. Гаршкоў А. Д. Прыродна-кліматычныя ўмовы ў познеледавіковы перыяд на тэрыторыі Беларус і іх уплыў на палеаэканоміку чалавека // Актуальные проблема экологии: сб. науч. ст. / М-во образования Респ. Беларусь, ГрГУ им. Янки Купалы, Гродн. обл. ком. природ. ресурсов и охраны окр. среды ; редкол.: А. Е. Каревский (гл. ред.), О. В. Павлова. – Гродно: ГрГУ, 2022. – С. 211–213.

13. Гаршкоў А. Д. Да пытання полава-ўзроставага падзелу працы на тэрыторыі Беларусі ў перыяд 40–8 тыс. гадоў да н. э. // Социальные, культурные и коммуникативные практики в динамике общественного развития: сборник научных статей / Гродненский государственный университет имени Янки Купалы; гл. ред. В. А. Белозорович ; редкол.: С. В. Адамович [и др.] ; рецензенты: И. К. Комарова, Е. Ф. Зданович. – Гродно: ГрГУ им. Янки Купалы, 2022. – С. 151–156.

14. Гаршкоў А. Д. Вынікі даследаванняў помніка Гарадзішча 7 (Пінскі раён) у 2022 годзе // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сб. научн. ст. / Полес. гос. ун-т ; под ред. В. И. Дуная, Р. Б. Гагуа и др. – Пинск: ПолесГУ, 2023. – Вып. 8. – С. 8–11.

15. Гаршкоў А. Д. Да пытання аб спецыялізацыі наканечнікаў культуры броме-лінгбі міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сб. научн. ст. / Полес. гос. ун-т ; под ред. В. И. Дуная, Р. Б. Гагуа и др. – Пинск: ПолесГУ, 2023. – Вып. 8. – С. 11–13.

**Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый**

16. Горшков А. Д. Типология кремневых финальнопалеолитических наконечников стрел из сборов Гродненского государственного историко-археологического музея // Актуальная археология 4. Комплексные исследования в археологии: материалы междунар. науч. конф. молодых ученых / г. Санкт-Петербург (2–5 апреля 2018 г.). – Санкт-Петербург: ИИМК РАН, 2018. – С. 87–90.

17. Гаршкоў А. Д. Крыніцы па вывучэнню эпохі палеаліту на тэрыторыі Беларусі // Подготовка научных кадров: опыт, проблемы, перспективы:

материалы Международной научно-практической конференции / г. Минск, (6 декабря 2019 г.). – Минск: ИВЦ Минфина, 2020. – С. 67–69.

18. Горшков А. Д. Наконечники культуры бромме-лингби на территории белорусской части бассейна р. Нёман // Актуальная археология 5: материалы международной научной конференции молодых ученых. – Санкт-Петербург: Невская Типография, 2020. – С. 138–142.

19. Гаршкоў А. Д., Касюк А. Ф. Папярэднія вынікі даследаванняў каля в. Заазер’е і пас. Гарадзішча Пінскага раёна Брэсцкай вобласці // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сборник научных статей по материалам V Междунар. научной конференции / г. Пинск, (27 ноября 2020 г.). – Пинск: ПолесГУ, 2020. – Вып. 5. – С. 13–21.

20. Гаршкоў А. Д. Засяленне берагоў возера Гарадзішчанскае (Пінскі раён) у познеледавіковы перыяд (14–11 тыс. кал. гадоў) // Пинские чтения: материалы I международной научно-практической конференции / г. Пинск, (15–16 сентября 2022 г.). – Пинск: ПолесГУ, 2022. – С. 451–454.

21. Гаршкоў А. Д. Асаблівасці тапаграфіі познеледавіковых паселішчаў на тэрыторыі Беларусі // XVI Машеровские чтения: материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых / г. Витебск, (21 октября 2022 г.) : в 2 т. – Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова, 2022. – Т. 2. – С. 61–62.

22. Гаршкоў А. Д. Да пытання аб спосабах палявання на тэрыторыі Беларусі ў першабытным перыядзе (300–8 тыс. гадоў да н. э) // Историческая наука: достижения, проблемы, перспективы [Электронный ресурс]: электрон. сб. материалов XIV Респ. науч.-практ. конф. студентов, магистрантов и молодых ученых / г. Брест, (15 апр. 2022 г.). – Брест: БрГУ, 2022. – С. 7–10.

**Тэзісы дакладаў на навуковых канферэнцыях**

23. Гаршкоў А. Д. Вывучэнне выхадаў крамянёвай сыравіны каля г. Гродна // ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы» (90-годдзю Інстытута гісторыі НАН Беларусі прысвячаецца): тэзісы II канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі / г. Мінск, (4-5 красавіка 2019 г.). – Минск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2019. – С. 15–16.

24. Гаршкоў А. Д., Велент-Шчэрбач С. С. Рэканструкцыя першаснага расшчаплення крэмню тэхнікай прамога ўдару (на прыкладзе неалітычных матэрыялаў Беларусі) // ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы» (90-годдзю Інстытута гісторыі НАН Беларусі прысвячаецца): тэзісы II канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі / г. Мінск, (4-5 красавіка 2019 г.). – Минск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2019. – С. 16–17.

25. Горшков А. Д. Памятники с материалами культуры броме-лингби на территории белорусской части бассейна реки Нёман // Восточная Европа, Кавказ, Ближний Восток в каменном веке: хронология, источники и культурогенез:

тезисы докладов международной конференции / г. Москва, (2–3 февраля 2020 г.). – Минск: ИА РАН, 2020. – С. 36–38.

26. Гаршкоў А. Д. Нуклеусы са стаянкі Кавальцы-1 у фондах Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея // ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы: тэзісы III канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі / г. Мінск (21 мая 2020 г.). – Минск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2020. – С. 41–42.

27. Гаршкоў А. Д. Эксперыментальнае даследаванне тэрмічнага ўздзеяння на крамянёвую сыравіну // ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы: тэзісы IV канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі / г. Мінск, (14–16 красавіка 2021 г.). – Минск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2021. – С. 32–36.

## РЭЗЮМЭ

**Гаршкоў Аляксандр Дзмітрыевіч**

**Культура броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана: засяленне, храналогія, матэрыяльная культура**

**Ключавыя словы:** археалогія Беларусі, фінальны палеаліт, культура броме, крэмень, Заходні Буг, Прыпяць, Нёман, храналогія, матэрыяльная культура, тэхналогія, тыпалогія

**Мэта даследавання** – выяўленне асаблівасцяў развіцця культуры броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана.

**Метады даследавання.** Дысертацыйнае даследаванне пабудавана на прынцыпах гістарызму, аб’ектывізму, сістэмнасці і каштоўнаснага падыходу. Выкарыстоўваліся агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, класіфікацыя, статыстычны) і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, перажыткаў, градацыйна-тыпалагічны, палявых даследаванняў, эксперымента, стратыграфічны, рэмантажу, картаграфіі) метады.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** У дысертацыі ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі праведзены параўнаўчы аналіз матэрыялаў, характэрных для культуры броме, якія паходзяць з міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці, Нёмана і асноўнага арэалу распаўсюджвання дадзенай культурнай адзінкі. Вызначаны ўплыў прыродна-кліматычных умоў на ступень засялення і спецыфіку гаспадарча-культурнага тыпу паляўнічых-збіральнікаў. Удакладнена канцэпцыя характарыстыкі палявання і збіральніцтва. Ахарактарызаваны гаспадарча-бытавыя комплексы і іх структурныя адзінкі. Упершыню для вызначэння функцыянальнай прыналежнасці наканечнікаў прыменены метады матэматычнай карэляцыі і вылічэння плошчы папярочнага сячэння. Уведзены ў навуковы зварот новыя матэрыялы, атрыманыя ў выніку археалагічных даследаванняў.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў.** Вынікі дысертацыйнай працы могуць знайсці практычнае прымяненне пры напісанні абагульняючых даследаванняў па археалогіі, старажытнай гісторыі Беларусі і Усходняй Еўропы.

**Вобласць выкарыстання:** археалогія, гісторыя, музейная справа.

## РЕЗЮМЕ

**Горшков Александр Дмитриевич**

**Культура бромме в междуречье Западного Буга, Припяти и Нёмана: заселение, хронология, материальная культура**

**Ключевые слова:** археология Беларуси, финальный палеолит, культура бромме, кремень, Западный Буг, Припять, Нёман, хронология, материальная культура, технология, типология

**Цель исследования** – выявление особенностей развития культуры бромме в междуречье Западного Буга, Припяти и Нёмана.

**Методы исследования.** Диссертационное исследование построено на принципах историзма, объективности, системности и ценностного подхода. Применялись общеисторические (анализ, синтез, классификация, статистический) и специально-исторические (историко-генетический, историко-сравнительный, историко-типологический, историко-системный, пережитков, градационно-типологический, полевых исследований, эксперимента, стратиграфический, ремонтажа, картографии) методы.

**Полученные результаты и их новизна.** В диссертации впервые в отечественной историографии проведён сравнительный анализ материалов, характерных для культуры бромме, которые происходят из междуречья Западного Буга, Припяти и Нёмана и основного ареала распространения данной культурной единицы. Определено влияние природно-климатических условий на степень заселения и специфику хозяйственно-культурного типа охотников-собирателей. Уточнена концепция характеристики охоты и собирательства. Охарактеризованы хозяйственно-бытовые комплексы и их структурные единицы. Впервые для определения функциональной принадлежности наконечников применены методы математической корреляции и вычисления площади поперечного сечения. Введены в научный оборот новые материалы, полученные в результате археологических исследований.

**Рекомендации по практическому использованию результатов.** Результаты диссертационной работы могут найти практическое применение при написании обобщающих исследований по археологии, древней истории Беларуси и Восточной Европы.

**Область применения:** археология, история, музейное дело.

## SUMMARY

**Aliaksandr Harshkou**

### Bromme culture in the interfluve of the Western Bug, Pripyat and Neman: settlement, chronology, material culture

**Key words:** archeology of Belarus, Final Paleolithic, Bromme culture, flint, Western Bug, Pripyat, Neman, chronology, material culture, technology, typology

**Research objective** – identification of the peculiarities of the development of the Bromme culture in the interfluves of the Western Bug, Pripyat and Neman.

**Research methods.** The dissertation research was built on the principles of historicism, objectivity, systematicity and value approach. General-historical (analysis, synthesis, classification, statistical) and special-historical (historical-genetic, historical-comparative, historical-typological, historical-systemic, vestigial, gradation-typological, field research, experiment, stratigraphic, repair, cartography) methods were applied.

**Outcomes of the research and its novelty.** In the dissertation, for the first time in the domestic historiography, a comparative analysis of the materials characteristic of the Bromme culture, which originate from the interfluve of the Western Bug, Pripyat and Neman and the main area of distribution of this cultural unit, is carried out. The influence of natural and climatic conditions on the degree of settlement and the specificity of the economic and cultural type of hunter-gatherers was determined. The concept of characterization of hunting and gathering is clarified. The economic and domestic complexes and their structural units were characterized. The methods of mathematical correlation and cross-sectional area calculation were applied for the first time to determine the functional affiliation of spearheads. New materials obtained as a result of archaeological research were introduced into scientific turnover.

**Recommendations on application.** The results of the dissertation work can find practical application in writing generalizing studies on archaeology, ancient history of Belarus and Eastern Europe.

**Field of application:** archaeology, history, museology.

Подписано в печать 21.03.2024 г. Формат 60х84/16
Бумага офсетная. Ризография.
Тираж 70 экз. Заказ № 015.

Отпечатано на технике издательского центра
Учреждения образования «Гродненский государственный
Университет имени Янки Купалы»
ЛП № 02330 / 146 от 03.04.2009 г.
Бульвар Ленинского Комсомола, 5, 230009, Гродно